Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Сялянская праўда

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Цана асобнага нумару 20 грош.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 грош., за радок пэтыту ў 1 шп

№ 21. Вільня, Нядзеля, 16-га лістапада 1924 г. Год I.

Да нападу на беларускіх паслоў.

Прапазіцыя паслоў з Беларускага Клюбу ў справе бандыцкага нападу на пасла Ярэміча, з'арганізаванага ўладамі бясьпечнасьці Пружанскага пав., Палескага ваяводзтва.

25 мая с. г. пасламі з Беларускага Клюбу Рагуляй. Ярэмічам і Валошыным было склікана справаздаўчае веча ў м. Пружанах. Улады бясьпечнасьці з'арганізавалі **банду з асадніка**ў з трох паветаў, а іменна: з Коссаўскага, Пружанскага і Кобрынскага, — якая **пры ўчасьці паліцыі разагнала веча**, кідаючы ў паслоў камяньні і б'ючы народ прыкладамі стрэльбаў. У свой час ў гэтай справе была пададзена інтэрпэляцыя п. міністру ўнутраных спраў, але дагэтуль **адказу Клюб не дастаў**. Характэрна, што сьледзтва ў гэтай справе вядзе камандант паліцыі Коссаўскага пав., п. Сомковіч, які мае на сабе вельмі многа закідаў у благіх адносінах да насяленьня і катаваньні яго (—прапазіцыя Клюбу „Wyzwolenie", прапазіцыя Беларускага Клюбу і чысьленыя інтэрпэляцыі).

Другое веча было склікана 10 лістапада с. г. пасламі з Беларускага Клюбу Ярэмічам і Тарашкевічам.

У 10 гадз. пасол Тарашкевіч асабіста паведаміў заступніка старасты аб назначаным вечы, паказаўшы месца веча—рынак перад саборам і час веча—12 гадз. Заступнік старасты, паклікаючыся на адміністрацыйныя правілы, прасіў выбраць такое месца дзеля веча, дзе ня спыняўся-бы рух, а што датычыць абабранага рынку перад саборам, дык—у прыпадку адмоўнага рашэньня—абяцаўся паведаміць паслоў да 12 гадз. у месцы, дзе яны затрымаліся. Калі ў 12 гадз. 30 мін. ад староства ня было ніякага адказу, паслы пайшлі на сказаны рынак і, выбраўшы месца, дзе сабраная публіка ня спыняла руху, распачалі веча ў 12 гадз. 50 мін. Калі пасол Ярэміч перад колькітысячным натоўпам распачаў сваю прамову, зьявіўся заступнік старасты і зьвярнуўся да паслоў з дамаганьнем, каб веча перанесьлі на край места. На запытаньне пасла Тарашкевіча, чаму да 12 гадз. староства аб сваей пастанове не паведаміла паслоў, заступнік старасты ніякага **адказу ня даў і, пагражаючы ўжыцьцем сілы**, пайшоў. Перанос веча ў гэты мамэнт быў зусім немагчымы, бо—з прычыны **ўзбуранага стану народу**—магло дайсьці да прост неаблічальных у выніках сваіх выпадкаў. Пасол Ярэміч, які ў той мамэнт прамаўляў, зьвярнуўся пару разоў да сабраных з прызывам захаваць поўны спакой пры ўсялякіх выпадках. Тым часам, **пракладаючы дарогу асадпікам**, падыйшоў да самае трыбуны адзін з старшых пшодовнікаў і, сказаўшы, што староства **паслала войска дзеля разгону веча**, стануў недалёка ад трыбуны ў групе паліцэйскіх агентаў і асаднікаў. Калі, з прычыны прыходу паліцыі і весткі аб вызаве войска, пачаўся рух сярод народу, пасол Ярэміч спыніў прамову і зышоў з трыбуны, кіруючыся спакойна ў іншае месца, каб стуль супакоіць народ. У той міг **здалёку пачуўся стрэл**, і адзін з вывядоўцаў паваліўся паслу Ярэмічу пад ногі з крыкам: „мяне забілі". У той-жа мамэнт у прысутнасьці і на вачах паліцыі з групы асаднікаў выскачыў чалавек (Marcin Siloł), які перад тым **паразумяваўся з паліцэйскім пшодовнікам**, і, падбегшы да пасла Ярэміча, **ударыў яго ззаду кулаком.** Пацярпеўшы схапіў злачынца за руку і паклікаў паліцыю, каб яго арыштавала. **Паліцыя бязчынна прыглядалася** да гэтага; толькі тады, калі напасьнік здалеў вырвацца, а **ўзбураны народ кінуўся на асаднікаў**, паліцыя скочыла з вінтоўкамі і затрымала народ, бароначы і засланяючы гэтак бязспрэчна напярод уплянаваны замах групы асаднікаў.

На падставе вышэйшага мы прыходзім да наступных вынікаў:

1) З таго факту, што староства ня прыслала паслом свайго адказу ў умоўленай гадзіне, а зажадала пераноса веча толькі тады, калі сабралася колькітысячная грамада, вынікае, што ўлада бясьпечнасьці сьвядома імкнуліся да **разьбіцьця веча**, а, магчыма, нават да **выкліка350ньня разрухаў**, каб пры помачы войска і паліцыі **разагнаць і стэрарызаваць народ.**

2) З увагі на тое, што напад на пасла Ярэміча быў зроблены ў прысутнасьці і пры поўнай бяздзейнасьці паліцыі, можам устанавіць, што **напад гэты быў замахам, загадзя падрыхтаваным з ведама і пры ўчасьці ўладаў бясьпечнасьці.**

Дзеля вышэйсказанага

Высокі Сойм рачыць пастанавіць:

Выбраць камісію з 8 сяброў дзеля разгляду справы аб карыгодным паступаньні ўладаў бясьпечнасьці ў Пружанах.

Варшава, 14 лістапада 1924 г.

Нацыянальны рэвалюцыянізм.

Сярод польскага грамадзянства пануе пагляд на беларускае пытаньне, што пытаньне гэтае быццам-то зьяўляецца не нацыянальным, а сацыяльным. Гэта гаворыць і польская лявіца, якая перакапана, што даволі беларускаму сялянству даць зямлю, і яно забудзецца аб сваей беларускасьці, і ахвотна кінецца ў абоймы „польскасьці".

Што сацыяльны элемэнт іграе ў нашай справе вялікую вагу, аб гэтым ня можа быць ніякае спрэчкі. Але справа ў тым, што падыход лявіцы да гэтага пытаньня — аднабокі і нязгодны з істотай таго зьявішча, якое прадстаўляе беларускае *нацыянальнае адраджэньне.*

Народ, у якім глыбака захаваны яго нацыянальныя асаблівасьці, — ня можа быць зьнішчаны. Нават тады, калі губляе сваю родную мову, ён не перастае жыць, і трэба толькі іскры, каб утоеная ў ім нацыянальная энэргія выявілася з выбуховай сілай. Так, ірляндцы даўно пераняла англійскі язык, блізу зусім забыўшыся свайго роднага, а тымчасам іх нацыянальная абасобленасьць ад запанаваўшых над імі англічан ня толькі ня счэзла, а, наадварот, давяла да запраўднае вайны, якая цераз сто з лішкам гадоў закончылася вызваленьнем Ірляндыі.

Ня зьнішчылі і беларускага народу ягоныя валадары, у працягу сталецьцяў забіраўшыя на службу сабе беларускую інтэлігенцыю, пераймаўшую чужую культуру і мову. Але прыйшоў час, і народныя масы збудзіліся з нацыянальнага сну. І прабуджэньне гэтае адбылося *выбухова—рэвалюцыйна*, пад грымоты расейскае палітычнае і сацыяльнае рэвалюцыі.

У Усходняй Беларусі адраджэнскі рух выліўся ў форме стварэньня ўласнае дзяржаўнае арганізацыі і шырокай культурна-нацыянальнай творчай працы. І гэтая самая рэвалюцыйная сіла нашага нацыянальнага руху, якая крышыла путы чужацкага панаваньня, *пасьля* здаваленьня сацыяльных дамаганьняў народу (—зямлі!) абярнулася ў сілу не руйнуючую, а *творачую*,—творачую культурныя цэннасьці. Найбольш характэрным з гэтага пагляду зьяўляецца стварэньне ў Менску — сучаснай сталіцы Усходняе Беларусі — *Беларускае Акадэміі Навук.*

Інакш стаіць справа на Захадзе. У Заходняй Беларусі, гдзе—пад уладай Польшчы—ня толькі не здаваляюцца нашыя сацыяльныя дамаганьні, але і нішчыцца нашая культура,—беларускі *нацыянальны* рух ніяк ня можа ўліцца ў русло мірнае творчае культурнае працы. Гэтая дарога перад ім *зачынена.* І вось, уся тая нацыянальная творчая энэргія, якая, пасьля выбуху яе, ператварылася ў культурную працу на Усходзе,—тут, на Захадзе, *расьце пад прэсам*, кондэнсуецца, згушчаецца і набірае ўсё больш і больш рэвалюцыйнае сілы.

Рэвалюцыйнае напружаньне ў Заходняй Беларусі мае пад сабой, бязспрэчна, і грунт сацыяльны, — і апошні ў гэты мамэнт выяўляецца з ня меншай сілай, як нацыянальны рэвалюцыянізм. Але той прыклад, які дае Усход, дзе іменна пасьля сацыяльнае рэвалюцыі пачаўся буйны расцьвет беларускага нацыянальнага руху, зьяўляецца найлепшым доказам, што і ў Заходняй Беларусі тыя, ці іншыя ўступкі сацыяльнага характару ніколі ня здолеюць аслабіць напружаньне нацыянальнага рэвалюцыянізму.

Мы затрымаліся тут на гэтым пытаньні затым, што ў складзе польскага ўраду робяцца перамены, якія пазваляюць спадзявацца ўступак з яго боку іменна сацыяльнага характару. Уваход у склад габінэту п. Грабскага нядаўнага лідэра „Вызваленьня", п. Тугутта, як віцэ-старшыні ўраду, найлепш гэта пацьвярджае: бо-ж знамянітыя „тугуттаўскія" законы аб мове беларускай у адміністрацыі і школе аказаліся пустым гукам і паказалі ясна, што ў *нацыянальным пытаньні* п. Тугутт з сваімі „вызваленцамі", як і ўся лявіца наагул (— праўда, без камуністаў), ідзе тым самым шляхам, як і ўсе другія польскія партыі—цэнтравыя і правыя.

Вось, у гэты мамэнт мы і лічым патрэбным асабліва адзначыць вагу беларускага *нацыянальнага рэвалюцыянізму*, якога не здаволяць ніякія дробныя сацыяльныя ўступкі з боку ўлады (—аб паважных уступках, ведама, няма што і казаць, бо іх ня будзе!). І далейшы націск польскае дзяржаўнасьці, іменна ў кірунку падаўленьня беларускіх нацыянальных імкненьняў, толькі будзе павялічываць іх сілу і адпорнасьць.

Рэканструкцыя ураду.

Адстаўка трох міністраў.

12/XI тры міністры—ўнутр. спраў, справядлівасьці і працы—падалі прэм'еру просьбы аб адстаўцы.

Навакол рэканструкцыі габінэту.

У аўторак прадстаўнікі 4 клюбаў польскай лявіцы зьвярнуліся да прэм'ера з дамаганьнем, каб пры рэканструкцыі габінэту ён увёў у склад ураду „прадстаўнікоў дэмакратычнай думкі", заявіўшы, што ад выпаўненьня гэтага будуць залежаць іх адносіны да ўраду.

Пас. Тугутт віцэ-міністрам!..

Пауафіцыяльны камунікат падае, што ў працягу 14/XI мае аканчальна вырашыцца асабісты склад рэформаванага ўраду. Апошнія тэлеграмы наказуюць, аднак, што да вечара ў чацьвер справа ня вырашылася.

Паслу Тугутту запрапанавана становішча віцэ-прэм'ера (як летась быў Карфанты ў габінэце Вітаса).

П. Тугутт даў сваю згоду, аднак зажадаў, каб звольніўшыяся партфэлі міністраў былі аддадзены асобам, якія будуць прыемлемымі для п. Тугутта.

З Сойму.

Апошняе слова прэм'ера Грабскага.

Пасьля таго, як выказаліся ўсе клюбы, прэм'ер узяў слова, каб адказаць на ўсю тую крытыку, якую выслухаў урад.

Дрэнна ў Польшчы, але ня зусім!

Прэм'ер згаджаецца, што ў Польшчы—дрэнна, як гэта сьцьвярдзілі яўна, ці пасярэдня ўсе клюбы, а перад усім прадстаўнікі сялян і работнікаў; не згаджаецца толькі з тым, што ў Польшчы—„вельмі дрэнна, дый ўсё горш“... Дрэнна ў нас, але што месяць (як сьцьвярджаюць... паданыя прэм'ерам лічбы даходаў скарбу ад цукру, тытуню і... гарэлкі!), робіцца ўсё ляпей...

Лепш, бо п'юць больш... гарэлкі.

„Кажуць, жартуе, п. Грабскі, што „чым горш жывецца, тым больш народ п'е гарэлку“, але я ў гэта ня веру“... Прэм'ер кажа, што ён зрабіў абмылку, сьцьвярдзіўшы ў сваей першай прамове шмат сумных рэчаў у Польскай дзяржаўнай гаспадарцы...

Лепш, бо так павінен казаць урад...

'Урад не павінен казаць народу аб сумных зьявішчах (!), але, наадварот,—толькі аб тым, што „daje otuchy“... Дык вось і няведама, ці прэм'ер кажа пацяшаючыя рэчы дзеля таго, што гэта — праўда, ці толькі дзеля таго, што „ўрад павінен пацяшаць“ і—„маўчаць аб сумным“?!.

Часовае „завастрэньне сітуацыі“ (! не паляпшэньне?) створана няўраджаем; дык і паляпшэньня трэба чакаць... ад будучага ўраджаю!.. Але вось ужо паўтара месяца, як палажэньне лагаднее..., як робіцца ляпей...

Лепш, а толькі дарагоўля расьце...

Дрэнна толькі тое, што... расьце дарагоўля!.. Але гэта—ад неўраджаю...

Кажуць, што дарагоўля выклікана палітыкай ураду, дазволіўшага вываз збожжа, і—валютнай рэформай. Першая прычына—запраўдная, але віна ў гэтым ня толькі ўраду, але і **ўсяго Сойму**, які 4 месяцы назад „гармонічна“ адобрыў гэтую палітыку, дазволіўшы вываз хлеба. Дык я змушаны быў падчыніцца волі вялікай большасьці Сойму, хаця, можа на гэты вываз ня трэба было пазваляць... А дарагоўля не залежыць зусім ад увядзеньня новай валюты—гэта сьцьвярджаюць лічбы (?)

Бюджэт—добры, бо лепшы за леташні!

Кажуць, што бюджэт нерэальны і што раўнавага яго ня будзе зьдзейсьнена...

Бюджэт на 1925 год перавышае ў даходах папярэдні на 169 мільёнаў злотых. Ці мы зьбяром гэткія даходы?—„Бязсумліўна“, адказывае прэм'ер. Бо... п'юць і кураць у Польшчы ўсё больш...

Чыгунка ў Польшчы ўжо не дае дэфіцыту і абходзіцца без дапамогі з боку скарбу.

Пагроза сваім „прыяцелям“.

Вельмі цікава адказвае прэм'ер на закід нерэальнасьці даходаў з падаткаў ад маемасьці і іншых беспасярэдніх, якіх ані буйныя прамыслоўцы, ані буйныя земляўласьнікі плаціць ня хочуць... П. Грабскі кажа, што будзе спаганяць бяз усякіх палёгак падаткі з прамыслоўцаў і абшарнікаў, ня **спыняючыся нават перад канфіскацыяй адпаведнай часткі маемасьці—зямлі ці акцыяў прамысловага прадпрыемства**. Высокія падаткі на буйную зямельную ўласнасьць наложаны, паміж іншым, і дзеля таго, каб падагнаць пераход зямлі з рук абшарнікаў да земляробаў... Дзеля таго ніякіх падаткавых палягчэньняў для маючых больш 300 гэктараў зямлі ўрад ня зробіць...

Польшча мае заграмічны крэдыт!..

На закід у тым, што ўрад ня рупіцца аб здабыцьці крэдыту заграніцай і ў краю, прэм'ер налічывае аж 473 міл. злотых, на якую суму Польшча ў тэй, ці іншай форме — праз урад ці праз прыватныя банкі (!) здабыла заграмічнага капіталу, як пазыку!.. (У тым ліку—400 м. ліраў італіянскай „пазыкі“—пад тытуновую манаполію — і 110 міл. злотых францускай пазыкі ...аружжам)...

Урад і Сойм—у згодзе...

Пасьля сьцьверджаньня вялікіх надужыцьцяў з боку платнікаў — прамыслоўцаў на Горным Сьлёнску і з боку розных „рольнічых таварыстваў“, прэм'ер канчае фінансава-эканамічную абарону ўраду заявай, што ў прынцыповых думках урад і большасьць Сойму—у поўнай згодзе. Дзеля таго ён лічыць магчымым і далей кіраваць дзяржаўным караблём Польшчы.

Далей аратар пераходзіць да сацыяльнай палітыкі ўраду.

Места і вёска.

Усюды места плаціць больш падаткаў, чым вёска; таксама і ў Польшчы. Існавала толькі адна дзяржава, дзе было наадварот, дый тая разваліласся якраз дзеля таго, што ў ёй з вёскі, з сялян бралі зашмат, а давалі мала (—якраз, як цяпер на нашых „Крэсах!“). У Польшчы няма сацыяльнага антаганізму (барацьбы, процідзейнасьці) паміж местам і вёскай (?), дый ня трэба штучна ствараць яго, як гэта шкодна робяць некаторыя паны на мітынгах.

У нас прывыклі казаць, што сялянам у Польшчы робіцца крыўда, дый што „пад Расеяй было лепш“. Але так кажуць адны „анальфабэты“.

Голас. Так кажа, ня толькі просты народ — сяляне!

Зямельнай рэформы ўрад не абяцаў.

На закід, чаму ўрад не праводзіць зямельнай рэформы, прэм. Грабскі адказвае, што **ён ніколі не абяцаў зямельнай рэформы**, а, наадварот, казаў, што яе трэба **адлажыць**, пакуль ня будзе праведзена рэформа валюты.

Вось цяпер, калі валюта добрая і грошы ёсьць (?), можна падумаць аб аграрнай рэформе.

„Крэсавая“ палітыка.

П. прэм'ер на закід, што за яго ўрадаваньне было больш нападаў, як дзён існаваньня габінэту, кажа, што нападаў і раней было даволі... — напрыклад, **у 1923 годзе былі аж 503 напады**, а ў 1922 годзе аж 878 нападаў.

Ваеннага палажэньня на „Крэсах“ ня будзе.

П. Грабскі заяўляе, што ён ня зробіць таго, на што яго папіхае правіца, не завядзе ваеннага палажэньня на „Крэсах“ і не баіцца за гэта закіду ў слабасьці... (дзіва, што ня ўвядзе **фармальна**, бо гэта-ж скандал на ўсю Эўропу!, — а датаго **фактычна** ...ваенны стан даўно існуе)!.. Прэм'ер абяцуе даць „Крэсам“ „успакаеньне“, „бясьпечнасьць“ (каму і ад каго?) і „зьліцьцё“ насяленьня з польскай дзяржаваю. Трэба таксама палепшыць адміністрацыйны апарат, рабіць у меру магчымасьці палёгкі ў падатках (асаднікам?) і ажывіць дапамогу крэдытам (тым-жа асаднікам!).

Заграмічная палітыка ўраду.

Пераходзячы да заграмічнай палітыкі ўраду, Грабскі бароніць працу мін. Скшыньскага, які сам падаў у Лізе справу меншасьцяў у Польшчы (заявіўшы, што польскім меншасьцям жывецца лепш, як у раю!). І гэта было вельмі спрытна, бо горш было-б, калі-б Ліга паслала ў Польшчу свайго дэлегата, „каб праверыць, як Польшча выпаўняе свае міжнародавыя забавязаньні“ (а гэтага ўрад і баяўся!).

Урад зробіць Польшчу „вялікім мацарствам“.

П. Грабскі сьцьвярдзіў, што яго ўрад „зрабіў крокі, каб забясьпечыць Польшчы становішча вялікага мацарства“... на выпадак, калі абодва „заборчыя мацарствы (Расея і Нямеччына) будуць прыняты ў сям'ю да вялікіх дзяржаў“. (!) Ня прыдзецца нам стаяць у сенцах, чакаючы на тое, што скажуць „вялікія“!..

Праграма ўраду.

У канцы прэм'ер каротка паўтарае абвешчаную ўжо ім праграму дзеяльнасьці ўраду, дадаючы, што зьдзейсьніць яе можна толькі ў атмасфэры супольнай працы ўраду, законадаўчых палатаў і грамадзянства.

Пасьля прамовы прэм'ера

Кс. Оконь, сьцьвярдзіўшы, што вокруг, які паслаў раней кс. Лютаслаўскага (эндэка), цяпер выбраў яго, Оконя, бо сяляне зразумелі ману і ашуканства эндэкаў, заяўляе, што Польшча павінна стацца радыкальнай сялянскай рэспублікай.

Пасьля прамаўляе ўкраінскі камуніст п. Скрыпа, які, заявіўшы аб злучэньні яго клюбу з „Саюзам пралетарыяту мест і вёсак“, прапануе выразіць недаверые ўраду Грабскага.

На наступным паседжаньні, як мы ўжо ведаем, прапазіцыя п. п. Рагулі і Васыньчука — аб тым, каб адкінуць бюджэт і выразіць недаверые ўраду, галасуецца часткамі і **адкідаецца**. Першая палова—аб недаверыі ўраду—адкінута большасьцяй 237 галасоў—усяго **польскага** Сойму—ад правіцы да лявіцы, **разам з немцамі**, — проці 52 галасоў—**беларусаў, украінцаў і жыдоў**. Другая, каб адкінуць бюджэт, праваліваецца ўсім польскім Соймам, разам з немцамі і жыдамі—**проці беларусаў і ўкраінцаў**.

З палякоў проці даверыя і бюджэту галасуюць толькі 2 камуністы.

Вось, чым скончыляся ўся тая грымотна-маланкавая баталія польскай лявіцы—P.P.S. і „Вызваленя“ проці ўраду. „Словы, словы, словы““!..

Трэба дадаць, што разам з беларусамі галасавалі за недаверые да ўраду п. Грабскага і тыя 4 сябры клюбу „Вызваленьня“, якія зараз-жа пасьля галасаваньня заявілі аб сваім выхадзе з партыі. Гэта яшчэ ярчэй адзначае няшчырасьць рэшты вызваленцаў.

Сьпешная прапазіцыя.

Беларускага Пасольскага Клюбу ў справе прымусовага высяленьня з Польшчы праваслаўных духоўных: архіяпіскапа Валадзімера і архімандрыта Ціхана.

14-га кастрычніка с. г. быў арыштаваны ў манастыры ў Дэрмані, на Валыні, праваслаўны архіяпіскап Валадзімер, гвалтам вывезены ў Варшаву, а пасьля выселены заграніцу—ў Чэхаславакію. Блізу аднача сна—15-га таго ж месяца—ў манастыры ў Жыровіцах, Слонімскага пав., быў арыштаваны архімандрыт Ціхан і прымусова выселены ў Нямеччыну. Арышт архімандрыта адбыўся пры гэткіх абставінах: 15-га прыехаў у Жыровіцы Слонімскі стараста з атрадам пешае і коннае паліцыі. Паліцыя заняла ўсё места, акружыла манастыр і сад, зачыніла ўсе выхады, прычым на падмогу паліцыі былі паклікаңы вучні тамтэйшае сельска-гаспадарскае школы. Тыя жыхары места, якія хацелі разьвітацца з пастырам і прасіць благаслаўленьня, былі зьняважаны і пабіты паліцыяй і вучнямі школы. Пабіты і зьняважаны гэткія асобы: Язэп Фэленчык, Юлія Сечань, Анна Гудзік, якая і дагэтуль хворая ад пабіцьця, Анастасія Петрашка, пабітая харунжым Каралём Каладзянам, і інш.

Апрача пабіцьця жыхароў, быў пабіты сам архімандрыт Ціхан вывядоўцам Марцінкевічам.

Паводле інфармацыяў сьвецкае і духоўнае ўлады, гэтыя рэпрэсіі проці вышэйшых дастойнікаў праваслаўнае царквы зьяўляюцца вынікам заходаў вышэйшае праваслаўнае духоўнае ўлады ў Польшчы, якая ня прызнана кананічнай архіяпіскапам Валадзімерам і архімандрытам Ціханам—з увагі на іх рэлігійныя перакананьні.

Усе вышэй пералічаныя пастулкі дзяржаўнае ўлады прадстаўляюць нарушэньне Канстытуцыі Польскае Рэспублікі.

Арт. 2 Канстытуцыі кажа: „Найвышэйшая ўлада ў П. Р. прыналежыць Народу. Органамі народу ў галіне законадаўства зьяўляюцца Сойм і Сэнат, у галіне выканаўчае ўлады — Прэзыдэнт П. Р., разам з адказнымі міністрамі, у галіне справядлівасьці—незалежныя суды“.

Арт. 3: „Дзяржаўнае законадаўства абыймае выдаваньне ўсялякіх законаў і спосаб іх выкананьня... Загады ўлады, з якіх вынікаюць правы і абавязкі грамадзян, маюць абязуючую сілу толькі тады, калі выданы на падставе закону і з паказаньнем яго“.

Арт. 111: „Ніводзін грамадзянін ня можа быць за сваё вызнаньне і рэлігійныя перакананьні абмяжованы ў правох, прыналежных іншым грамадзянам“.

Арт. 115: „...Адносіны Дзяржавы да цэркваў рэлігійных меншасьцяў будуць устаноўлены дарогай законадаўчай...“

Ня гледзячы на гэтыя загады Канстытуцыі, выканаўчая ўлада

1) дапускае ўжываньне brachium seculare ў адносінах да прадстаўнікоў праваслаўнае царквы, інакш: сьвецкая ўлада стаецца выканаўчым органам духоўнае ўлады, што пярэчыць артыкулам 2, 3 і 115 Канстытуцыі:

2) накладае кары за рэлігійныя перакананьні;

3) пасягае на правы незалежных судоў, сама вызначаючы кару.

Дзеля вышейшага

Высокі Сойм рачыць пастанавіць:

Заклікаецца Урад 1) ўраз-жа перастаць мяшацца ў унутраныя справы праваслаўнае царквы да часу ўладжаньня гэтае справы законадаўчым шляхам; 2) узяць назад загады аб высяленьні архіяпіскапа Валадзімера і архімандрыта Ціхана і дазволіць ім вярнуцца да краю; 3) пакараць дзяржаўныя ўлады, якія пабілі архімандрыта і жыхароў м. Жыровіц.

Варшава, 4 лістапада 1924 г.

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Канфэрэнцыя аб абароне ўсходніх граніцаў.

8/XI ў Варшаве адбылася вялікая нарада (запраўдны кангрэс!)—ў справе абароны Усходніх граніцаў. У канфэрэнцыі прымалі ўчасьце мін. ўнутр. спраў, як (старшыня), усе ўсходня крэсовыя ваяводы, шэф генар. штабу ген. Гальлер, віцэ-мін. Ольпіньскі, дырэктары дэпартамантаў мін. ўнутр. спраў, камандзір пагранічн. корпусу ген. Мінкевіч, галоўны камандант дзярж. Паліцыі Божэнцкі, шэф II аддзелу генар. штабу палк. Пайпер, а таксама—рад вышэйшых урадоўцаў службы бясьпечнасьці мін. ўн. спр. і вышэйшых ахвіцэраў ген. штабу.

Замах на ваяводу.

З Торуня наказуюць, што вояводзкі радны Попель зрабіў замах на паморскага ваяводу Ваховяка, выпусьціўшы ў яго 5 рэвальвэрных стрэлаў. Замах ня ўдаўся: ваявода астаўся цэлы. Ранены абараніўшы ваяводу паліцыянт. Чым выклікаьы замах, няведама.

Новы клюб.

Тры паслы, якія толькі што выйшлі з „Wyzwolenia“, стварылі разам з п.п. Баліным і Шакуном новы клюб „Сялянскай незалежнай партыі“.

Заява клюбу „Wyzwolenie“.

З прычыны выхаду з клюбу „Wyzwolenie“ яго крэсавых сяброў, урад клюбу абвяшчае, што гэты крэсавыя паслы былі толькі лішнім цяжарам для клюбу і ў працах яго ніякага ўчасьця ня прымалі...

Дык — акурат таксама, як і... „Крэсы“ для Польшчы!—У гэтым—глыбокі зьмест і сэнс усіх гэных „выхадаў“. „адпадаў“ і „разломаў“ у „Wyzwoleniu“...

„Хіена“ трашчыць.

У эндэцкім лагеры паніка: „хадэкі“ з Карфантым на чале выходзяць з пакорнасьці і здраджаюць „Хіену“. „Obóz narodowy“—разьбіваецца... „Эндэцыя“ астаецца ў адзіноцтве...

П. Карфанты ў толькі што купленай ад п. Падэрэвскага „Rzeczypospol.“ аб‘явіў вайну эндэцыі, „не разьбіраючы спосабаў“. Карфанты выробляе для Грабскага „цэнтра-лев“—лева-цэнтравую большасьць у Сойме.

„Будучына пакажа, ці „Хрысьціянская дэмакратыя“ пойдзе тым шляхам, на які піхае яе п. Карфанты“,—піша „Gaz. Warszawska“.

„Аграрная рэформа“ ідзе...

Як ведама, новы міністар „reform rolnych“ раскрытыкаваў у першым сваім выступленьні ў зямельнай камісіі сваіх нічога не рабіўшых папярэднікаў і супрацоўнікаў і абяцаў... цераз 3 тыдні падаць новы пекны праект зямельнай рэформы. А пакуль прасіў камісію адпачыць і—не разглядаць праекту, апрацаванага клюбам „Вызваленьне“...

Прайшло ўжо больш месяца... камісія, адпачыўшы, нарэшце сабралася... Але п. міністар—паведаміў яе, што „праца над праектам ужо падыходзіць да канца... і праек у хуткім (але ўжо неакрэсьленым бліжэй!) часе будзе паданы.

Тады вызваленцы паднялі ізноў справу свайго праекту, бо міністар ня споўніў свайго слова...

Але зямельная камісія—таксама, відаць, не спяшаецца з зямельнай рэформай, як і спэцыяльны міністар „зямельных рэформаў“,—і прапазіцыя „Вызваленьня“ была адкінута...

Камісія пастанавіла далей чакаць, ня робячы нічога.

Заграніцай.

Ультыматум Клайпэды Літве.

Прыбыўшая ў Коўну дэлегацыя праф. Саюзаў Клайпэды сац.-дэмакр. партыі заявіла літоўскаму ўраду катэгарычнае трэбаваньне правядзеньня ў жыцьцё аўтанамічнага стану для Клайпэды. У прыпадку адмовы ўраду, праф. Саюзы Клайпэды пагражаюць зьвярнуцца з скаргай на літоўскі ўрад да міжнародавых работніцкіх арганізацыяў.

Прамова Рыкава.

У дзень угодкаў камуністычнай рэвалюцыі старшыня Рады Нар. Камісараў, Рыкаў, на прыёме журналістаў сказаў прамову, у якой, паміж іншым, заявіў, што і з новым англійскім урадам радавы ўрад наладзіць добрыя адносіны, бо гэтага вымагае карысьць абодвух краёў. Паражэньне работнікаў у Англіі — толькі часовае. Прызнаньне Францыяй — вялікая здабыча СССР. Задача цяпер — апрацаваць і правясьці радава-францускую ўмову.

Сваю прамову Рыкаў закончыў так:

„У гэтым годзе мы в. значна зблізіліся з заходнімі народамі. Гэтае збліжэньне павінна йсьці далей,—каб мы маглі хутчэй памагчы заходнім народам скінуць ярмо імпэрыялізму“.

Пералом у адносінах Амэрыкі да СССР.

Амэрыканскі карэспандэнт англ. газэты „Times“ піша, што ў кіруючых кругах Вашынгтону адносіны да Радавай Расеі зьмяніліся радыкальна. Амэрыканскія капіталісты прыхіляюцца ўжо да прызнаньня радавага ўраду, ды гэтаму быццам ужо не працівіцца і Кулідж. Спадзяваная адстаўка ворага Радаў, мін. Юза, таксама пацьвярджае гэтыя весткі.

Англійскія работнікі за паразуменьне з СССР.

У Маскву прыехала дэлегацыя ад англійскіх прафэс. саюзаў. Старшыня дэлегацыі сказаў на вакзале прамову, у якой заявіў, што арганізаваныя англійскія работнікі пастараюцца, каб ніводзін транспарт аружжа, скіраваны проці СССР, ня выйшаў з англійскіх портаў, ды што яны прыложаць усе сілы, каб англа-радавае паразуменьне дайшло да мэты.

Выезд папскага нунцыя з Парыжу.

У сувязі з парваньнем дыпляматычных адносінаў паміж францускім урадам і Ватыканам, спадзяюцца хуткага выезду з Парыжу папскага нунцыя (пасла).

Разрыў, як ведама, выкліканы новым баявым курсам ураду Эрыо проці распаношыўшагася ў Францыі пасьля вайны — асабліва за п. Пуанкарэ — клерыкалізму (засільля палітыкуючых ксяндзоў).

Што было ў Барцэлёне?

Гішпанская цэнзура генаральскага ўраду в. пільна сьцеражэ, каб сьвет ня ведаў нічога аб тым, што робіцца ў Гішпаніі, якая ўся ўжо ажно кіпіць.

Дзеля таго акуратна ня ведама, што сталася гэтымі днямі ў Барцэлёне. Ведама толькі, што там меў мейсца крывавы замах збройных паўстанцаў на дыктатуру ген. Прыма-дэ-Рывэры. Замах быў арганізаваны анархістамі, з якімі войскі вялі запраўдныя бітвы каля казармаў.

У месьце абвешчана асаднае палажэньне.

Апошнія весткі кажуць аб крывавым падаўленьні паўстаньня і дзікай расправе з насяленьнем места...

Вайна чорнагорцаў з албанцамі.

У сувязі з забойствам албанскай бандай чорнагорскага ўрадоўца — паміж албанцамі і чорнагорцамі ўзьнялася запраўдная вайна. Некалькі тысячаў чорнагорцаў у баявым парадку перайшлі праз граніцу Албаніі, палячы вёскі і забіваючы албанцаў, якія адказываюць таксама аружным адпорам.

Адчыненьне італьянскага парляманту.

Пасьля некалькіх „прыватных спробаў“ афіцыяльна адчынена сэсія італьянскага парляманту. На лаўках апазіцыі быў адзін толькі камуніст Рэноўскі (?), які таксама вышаў.

На пярэдадні аб‘яднаная апазіцыя выдала адозву, у якой заяўляе, што ня прыме ўчасьця ў працах Сойму, пакуль агульны стан бясьпечнасьці і законнасьці ў краі ня будзе радыкальна зьменены ўладай.

Канец забастоўкі ў Аустрыі.

Забастоўка чыгуншчыкаў скончылася іх перамогай. Ад 12 гадз. ўночы на 12/XI усе цягнікі пайшлі.

У Югаславіі.

Афіцыяльны камунікат падае вельмі цікавыя весткі аб тым, як і дзеля чаго праваліўся дэмакратычны ўрад Давідовіча з учасьцем харватаў і Радіча. Кароль ня толькі ня прыняў на аўдыэнцыі прэзыдыуму Скупшчыны (Сойму), у склад якога ўваходзіў, як віцэ-старшыня, „радічавец“ д-р Мацэк, але яшчэ паставіў варункам, каб перад уваходам у склад ураду партыя Радіча адраклася ад усялякай сувязі з Маскоўскім Інтэрнацыяналам (гэт. зв. „зялёным“ — сялянскім). На гэта Радіч быццам адказаў, што будзе і надалей падтрымліваць сувязь з бальшавікамі і што Чычэрын нават абяцаў яму маральнае і матар‘яльнае падтрыманьне ў барацьбе з Белградам...(?!).

Роспуск парляманту ў Югаславіі.

10.XI на апошнім паседжаньні Скупшчыны прадстаўнік габінэту Пашыча паведаміў Сойм аб стварэньні новага ўраду і прачытаў каралеўскі загад аб роспуску Сойму.

Новыя выбары адбудуцца толькі 8 лютага.

„Кароль“ Гусэйн.

Арабскі карэспандэнт англійскай газэты раскрывае прошласьць Гусэйна, якога Англія пасадзіла за караля над арабамі. Аказваецца, што ён быў адным з самых буйных „камэрсантаў“—гандляром нявольнікамі. Нявольнікі, якіх прадавалі на арабскіх рынках, дастаўляліся Гусэйнам, які на чале аружных бандаў захопліваў караваны багамольцаў-магамэтанаў, або суданцаў, ці нэграў з Афрыкі.

ХРОНІКА.

Да пахарон прат. М. Галенкевіча. Пасьля адпяваньня цела ў Сьв. Траецкай царкве, ад імя беларускага грамадзянства выступіў дырэктар віленскай беларускай гімназіі, грам. Р. Астроўскі, з прамовай, у якой адзначыў беларускія ідэалы памершага, за якія змагаецца беларускі народ і далей.

Прамова гэтая—пасьля трафарэтных выступленьняў афіцыяльных прамоўцаў духавенства — зрабіла глыбокае ўражаньне на прысутных, пераважана прыехаўшых у Вільню пасьля выхаду немцаў і незнаёмых з працай прат. Галенкевіча на беларускім грунце.

Зьезд старавераў. „Dz. Wil.“ піша, што ў канцы гэтага месяца ў Вільні зьбярэцца зьезд старавераў Віленшчыны, а пасьля яго — ў хуткім часе—ў Вільні-ж адбудзецца зьезд стараверау з усей Польшчы.

Варта-б было, каб нехта далажыў на гэтых зьездах аб тэй ролі, якую іграў у часе выбараў „паўнамоцнік“ усіх стараверау Віленшчыны „капітан Лазараў“ — супрацоўнік дэфэнзывы, як сьцьверджана шэфам Горадзенскае дэфэнзывы, капітанам Ярэцкім, на Беластоцкім працэсе!....

Палёгкі ў выдачы пашпартаў. Міністэрства ўнутр. спраў маніцца ў хуткім часе выдаць новыя правілы, якімі ў вялікай меры аблягчыцца дабываньне насяленьнем польскіх пашпартаў.

Зьезд старостаў. На 15 і 16 лістапада ў Вільню скліканы зьезд старостаў Віленскага ваяводзтва.

Карэспандэнцыі.

Языковыя ўставы „памагаюць“

(*З Слонімскага пав.*).

Даведаўшыся з газэт, што Сойм прыняў і ўхваліў закон аб беларускай школе, сход у вёсцы Чэмеры, Слонімскага павету, пастанавіў, каб у іх вёсцы зрабілі „przekształcenie“ існуючай польскай школы ў школу беларускую. Сходам зроблены сьпісак 80 дзяцей шкаляроў, выстаўлены кандыдат на пасаду вучыцеля, зроблены плян лекцыяў і сьпісак падручнікаў школьных і ўсё, што толькі было патрэбна.

23/IX гэты прыгавор праз упаўнамочаных Баравіка і Буравіча быў аднесены да Чэмерскай Рады Гміннай, якая, разгледзіўшы справу, знайшла, што на гэную школу ўхвалы Рады не патрэба, трэба, каб толькі сцьвярдзіў „Ужонд“ гміны. Пісар і войт падпісалі, і ўпаўнамочаныя панясьлі паперы да Слонімскага школьнага інспэктара п. Кажана.

25/IX інспэктар прыняў дэлегацыю і зазначыў, што, як з гэнай справай зрабіць, ён ня ведаець, бо няма яшчэ распараджэньня зьверху, а тым часам хай дзеці ходзяць у школу польскую. На гэта ўпаўнамочаныя сказалі, што дзеці ў вёсцы Чэмеры ня пойдуць у польскую школу, бо нічога папольску ні дзеці, ні іх бацькі не разумеюць, што за тры гады польская школа не навучыла ня толькі пісаць ці чытаць, але нат‘ і лічыць папольску да дзесяці, што ў вёсцы ўсе беларусы і няма ніводнага, хацеўшага вучыць сваіх дзетак папольску, што за ўвесь час існаваньня польскае школы хадзіла ня больш, як 20 дзяцей замест 80 і то пад прымусам, бо баяліся кары. Пан інспэктар такі стаяў на сваём, сказаўшы, што, пакуль у вёсцы ёсьць школа польская, ня можа быць і гутаркі аб школе беларускай. Пан інспэктар у той самы дзень прыслаў вучыцеля і мусіць даў яму суровую інструкцыю, бо, прыехаўшы ў вёску, вучыцель адразу разаслаў павесткі для кожнага вучня, каб зараз-жа ішлі да школы, а не—будуць караны. Атрымаўшы павесткі, бацькі вельмі перапалохаліся, ня ведаючы, што ім рабіць. Яны ў сваім прыговоры напісалі, што складаюць з сябе абавязак плаціць кары за не пасылку сваіх дзяцей у польскую школу, а тут на! Штраф-кары.

Найбольш палахлівыя паслалі дзяцей. Вучыцель пачаў вучыць. Праз якія пару тыдняў ён напалохаў дзяцей так, што тыя з вялікім страхам пераступаюць цераз парог польскай школы. За гэты час ён пабіў і вельмі штучна гэтакіх вучняў: дачку Палагеі Хвесені, сына Васіля Дземешэвіча, сына Лукаша Міскі Віктара, сына Андрэя Хрэмчэні і шмат іншых.

На сходзе сялян вёскі Чэмеры 3/XI сяляне радзіліся, дзе шукаць праўды, да каго зьвяртацца, каб хоць не катавалі так іх дзетак у польскай школе. Дочка Палагеі Хвесені ў школе зьвярнулася да вучыцеля, каб ён паказаў ёй літару, дык пан настаўнік, узяўшы яе за вушы, пачаў прыгінаць галоўку дзяўчынкі да лаўкі і таўчы лобам аб парту. Б‘ець па патыліцы, па галаве, па плячох, ставіць на цьвіках на каленкі і ўжываець іншыя інквізытарскія спосабы. А сход, сабраўшыся, пабядаваў, ды, пахіліўшы сваю гарамычную галоўку, кажа: „вось якія языковыя законы выпрацаваў для нас беларусоў Сойм, вось да чаго мы дажыліся“. Нат‘ паліцыя ў Слонімскім павеце да гэтага часу ня ўжывала такіх караў для нас, якія цяпер ідуць на „языковых законах“. Разводзяць рукамі сяляне, сумуюць, ня ведаючы ці аштрафуюць за не пасылку дзяцей, ці не? А што як аштрафуюць, ды вывядуць апошнюю кароўку з хлява?! Вось вам і языковыя законы, вось вам і беларуская школа. А пан інспэктар і другі раз упаўнамочанаму ад вёскі Баравіку сказаў, што „да гэтага часу прыгавор ваш у мяне, але няма распраджэньняў зьверху, а калі яны будуць—ня ведаю, а тым часам хай вашы дзеці ходзяць у польскую школу“. Дзеці плачуць, ня хочуць ісьці ў польскую школу, бо баяцца вучыцеля, як вагня, бацькі гоняць дзяцей з хаты,—баючыся штрафаў, і што дня йдуць гутаркі толькі аб языковых уставах. **Чамеравец.**

Б‘юць!

(*Горадня*).

У кастрычніку м., 1923 году наняўся я дворнікам да дамаўласьніка пана Рыгора Дулевіча на Сапэрнай вуліцы № 13. За маю працу п. Дулевіч згадзіўся даць мне кватэру, малую грашавую плату і склеп, дзе я мог палажыць дровы і розны хлам сваёй невялікай гаспадаркі. З маей працы гаспадар дому быў здаволены, а я быў шчасьлівы, маючы дах над галавою для сябе, жонкі і малых дзетак.

Шчасьце мае цягнулася ня доўга. У гэтым доме самаўпраўна захапіў кватэру пан паручнік з ДОК III Гэпік Марыян. Спачатку гаспадар дому, п. Дулевіч, быў вельмі нездаволены такім кватарантам, але потым яны пагадзіліся паміж сабою і сталі вельмі добрымі прыяцелямі. У хуткім часе пану паручніку падабаўся мусіць склеп, дзе ляжалі мае рэчы, і ён стаў старацца адабраць яго ад мяне. Стаў разам з гаспадаром шукаць прыклёпу на мяне, і вось прыклёп знайшоўся.

У красавіку гэтага году ў Горадні з‘арганізаваўся „związek dozorców“, імкненьне якога — бараніць дазорцаў проціў гвалтаў і несправядлівасьцяў дамаўласьнікаў. Меў шчасьце і я запісацца сябрам гэтага „związku“. Ад „związku“ атрымаў я „Ugodu warunków pracy i wynagrodzenia dozorców domowych“, якую для азнаямленьня падаў гаспадару. Гэта гаспадару не падабалася і, прачытаўшы гэную „угоду“, адказаў, што ён ня будзе бегаць па кватарантам і зьбіраць для мяне грошы, а адначасна загадаў мне, каб я выкінуў свае рэчы з склепу.

З красавіка м. г. г. мне перасталі плаціць, як гаспадар, так і кватаранты. З склепу сваіх рэчаў я ня вынес, бо гаспадар дому ня даў другога месца, затое

цяпер прыходзіцца цярпець. 8 верасьня г. г. гаспадар адпраўляў імяніны і, відаць, умоцнілі свае кумпанства з паручнікам, бо назаўтрае, калі мяне і жонкі ня было дома, жонка гаспадара разам з жонкаю паручніка—Міхалінаю і ардынансам паручніка Гілярым Млынарскім выбілі дзьверы ў склепе, і ардынанс па загаду п. паручніковай пачаў выкідаць стуль мае рэчы. Гэта заўважылі мае дзеці і сказалі жонцы. Жонка ня верыла, але хутка сама праканалася. Спачатку прасіла жонка не выкідаць рэчаў да майго прыходу, але, бачучы, што гэта дарэмна, пачала не даваць. Жаўнер пакінуў выкідаць, але пані паручнікова пачала сьмяяцца з яго, кажучы: „Polski żołnierz i nie może poradzić sobie z kobietą-bolszewiczką!“. Ардынанс, выслухаўшы такую мараль, кінуўся на маю жонку і тры разы кінуў яе аб зямлю. Мая жонка пачала крычаць. На крык выйшлі гаспадар з паручнікам, адаслалі сваіх жанок да пакою, гаворачы што яны самы парадзяць з гэтаю кабетаю, „zatkną jej pysk“. Яны і парадзілі: паручнік стукнуў колькі разоў жонку плячмі аб сьцяну, а потым адчыніў дзьверы да мойго пакою і кінуў яе туды так моцна, што яна абабіла сабе галаву і ногі аб стаячую тут шафу. Адначасна пан паручнік лаяўся такімі словамі, якія паўтарыць тут ня мейсца. Ад такога пачастунку жонка страціла прытомнасьць, а калі апрытомнела, дык мусіла вылезьці праз вакно, бо дзьверы былі падперты паручнікам і гаспадаром, і пайшла па паліцыянта. Дачка-ж 9-х гадоў, баючыся аставацца ў хаце, па прыкладу маці, хацела вылезьці праз вакно, але, атрымаўшы ад пана паручніка падарунак нагою ў бок, звалілася няпрытомна назад з вакна ў хату. Паліцыянт, нумару якога жонка ня помніць, прыйшоў, паглядзеў на раскіданыя рэчы, плачучых перастрашаных дзяцей і пашоў у пакоі да паручніка, каб даведацца прозьвішча паручніка, дзе і растаяў як цукар, бо больш яго жонка ня бачыла. З кватарантаў ніхто на двор ня выйшаў, пачуўшы голас паручніка, якога ўсе баяцца, як вагню. Дзеялася гэта каля 5—6 гадзіны па палудні.

Я вярнуўся дамоў каля 9 гадзіны вечара. Уся сям'я ляжала ў пасьцелі, зьбітая, перастрашаная. Даведаўшыся, у чым справа, я паклікаў паліцыянта № 3548 і жандара напісаць пратакол. Пратакол напісалі, але паручнік з гаспадаром з свайго боку напісалі пратакол на маю жонку, дзе паказалі, што мая жонка называла іх „polska morda“, „bandyty“; але гэта, відзіць Бог, няпраўда! Пэўне выйдзе так: „мяне пабілі, мяне судзілі, мяне і пакараюць“.

Міхал Кулаковскі.

20 кастрычніка 1924 г.
Горадня, Сапэрна вул. № 13.

„Адбудова“.

(*В. Бялевічы, Беластоцкага пав.*).

Жыхары нашае вёскі былі страшэнна напалоханы паперай старасты павету. Як-жа не палохацца, калі ў паперы ясна сказана: згодна з пастановай Гарадоцкай гміннай рады, забраць школьны будынак у в. Бялевічах.

Трэба адзначыць, што радныя нашай гміны ўсе—багатыры: было пару бедных, але тых „выгналі“. Сяляне заварушыліся, пытаючыся рады: пыталіся ў войта, але той нічога не парадзіў, толькі сказаў: „забяруць, дык папрaвяць, а ў вас зьгніе“. Але, дзякуй добрым людзям, яны нам парадзілі сьпісаць пратакол, падпісаць, і прасіць дамагацца роднай школы, што мы і зрабілі. Адалі ня верыцца, каб урад ды дапамог адчыніць школу. **Мінчук.**

За што гэтак зьдзекуюцца?!

(*Вёска Міхнавічы, Беластоцкага пав.*).

У нядзелю, 19 кастрычніка, праз вёску Міхнавічы, Беластоцкага пав., прахадзілі польскія ўланы, каторыя затрымаліся адпачыць у тэй вёсцы. Угяўшы вясковага солтыса і падводу, пачалі зьбіраць у вяскоўцаў для сваіх каней па пуду сена, каторае і было ім дадзена. Казалі, што быццам заплацяць; ды ня ведаю, заплацілі, ці не. Даўшы коням сена, пашлі хадзіць па хатах, трэбуючы сабе есьці „jajek i mleka“. Вядома, ніхто ня мог адмовіцца: так яны прасілі „далікатна“ — па воўчу. Мала таго; яшчэ хадзілі самавольна па хлявох, лавілі кур і што ім падабалася.

Ды, дзякаваць Богу, стаялі ня доўга, бо, калі-б пастаялі даўжэй, то палавілі-б усіх кур у вяскоўцаў. Праз некалькі гадзін праз тую-ж вёску ехаў абоз, каторы складаўся з мяйсцовых вяскоўцаў і так-жа затрымаўся, каб зьмяніць падводы. Жаўнеры, каторыя ішлі з абозам пашлі па хатах, прыказваючы запрагаць коні і ехаць. А, як хто адзываўся, кажучы: няма каня дома, або няма ваза, дык атрымліваў адказ: „milcz!.. ato mordę pobiję“. Прычапіліся да аднаго хлапца, ў каторага дома ня было бацькоў, — Аляксандра Белага, кажучы яму: „dawaj konia“. Хлапец стаў упірацца, кажучы, што няма нікога дома; тагды ўланы пачалі зьдзекавацца над бедным хлопцам перад вачыма некалькіх вяскоўцаў: Білі яго прыкладамі, а хто нагайкай, білі па твару, а другія крычалі: „związać go i do fury“, і ніхто ня мог у абарону беднага хлапца сказаць слова, баючыся за сваю сьпіну: скажы слова, палічаць цябе бандытам і баста.

Выяжджаючы з вёскі, пачалі страляць і лавіць парасят, кідалі шаблямі ў кур, перабівалі ім ногі і забіралі. Нават у аднаго хлапца адабралі маленькага сабачку, а яго зьбілі, чаму не даваў!

Вачавідзец.

„Дабравольны збор“.

(*Маладэчна, Вялейскага пав.*).

28 кастрычніка дзьве тутэйшыя жыдоўскія дзяўчыны хадзілі зьбіраць „дабравольныя“ ахвяры на будову аэрапляну. Калі-ж хто адмаўляўся, дык кажуць: „Мусіш даць, бо, калі не дасі, то сам сабе пашкодзіш. Сьпісак ахвяр будзе пераглядаць каманда паліцыі, і хто ня дасьць, таго ўпішуць у „чорную кніжку“, а гэта значыць: чуць што якое, дык і ўпішуць табе пратакол, і штраф заплоціш“.

Вось, як „дабравольна“ зьбіраюцца ў нас ахвяры на абарону „Ojczyzny“... **Праезды.**

Расправа самасудам.

(*Докшыцкая гм., Дунілавіцкага пав.*).

У в. Касьцюках нашай гміны, уноч з 22 на 23 кастрычніка, паліцыя забіла ў хаце на сьмерць стрэламі з рэвальвэра дэзэртыра, — жыхара гэтай вёскі, Уладзімера Касьцюка.

Нашая паліцыя добра знаець, што кожнаму чалавеку раней ці пазьней трэба адпраўляцца туды, гдзе няма „ні хворасьцяў ні сумаваньня“, дык і не клапаціцца перадаваць гэткае „bydła“ суду.

Тутэйшы.

„Лоўкі ўлан“.

(*М. Докшыцы, Дунілавіцкага пав.*).

У нашым мястэчку ўжо нейкі час стаяць уланы. Разьмясьціліся яны па хатах у мястэчку: — мусіць дзеля аздобы мястэчка. Тутака на вуліцах мястэчка панастроілі ўсялякіх загарадак, канаваў, брам і скачуць на конях праз іх. Як відаць, нашаму судзьдзі і магістрату, якія маюць пры гэтай вуліцы свае канцалярыі, спадабалася гэтае дармавое (бо адзін раз з паноў хадзіўшых глядзець, як скачуць уланы, бралі грошы!) прадстаўленьне, якое робіцца перад іх вокнамі на вуліцы, ды не клапацяцца, каб даць уланам другое мейсца вучыцца гдзе небудзь за мястэчкам, ня гледзючы на тое, што па гэтай вуліцы маючым патрэбу да судзьдзі ці магістрату няма як ні прайсьці, ні праехаць, а жыхарам гэтай вуліцы няма як прагнаць у поле сваю скаціну бяз рызыкі быць падбітым канём, ці засечаным „нялоўкім“ уланам, якія тутака па вуліцы носяцца на конях і сякуць шаблямі пруткі.

Кажу „нялоўкім“, бо ў нас ёсьць „лоўкія“ ўланы і „нялоўкія“. Вось-жа слухайце. Ня дужа даўно ў нашае мястэчка прыехаў якісь-то „ўлан“, толькі „другога палку“, бо меў на сабе другую хворму. Колькі дзён гуляў гэты „ўлан“ з „нашымі“ ўланамі і нарэшце ўначы забраўся ў стайню нашых „нялоўкіх“, каторыя не маглі ўвартаваць стайні, і, вывеўшы двух каней (аднога з сядлом), уцёк заграніцу.

Апавядаюць, быццам гэты „лоўкі“ ўлан быў ад бальшавікоў, дзе пайшоў у заклад са сваімі таварышамі, што ўкрадзець ад „нашых“ уланаў коні. Калі гэта праўда, дык заклад выйграў. Цікава, што гэтага „ўлана“ не здалела затрымаць і пагранічная паліцыя ў вёсцы Восава, дзе ён ехаў, а толькі выстраліла ў паветра. Ну, дык ці ня „лоўкі“ гэта ўлан?

Тутэйшы.

Служы прыгон!

(*З Сьвянцяншчыны*).

У маёнтку Данюшава, Жодзішскае гміны, сэрвітутную зямлю пан Кярсноўскі прадаў вёсцы Маркаўцы, а перад гэтым на другім участку сэрвітутнае зямлі лес высек і прадаў, звазіўшы на бераг, ня гледзячы на ўсе пратэсты вёскі, якая сьпярша не давала сеч лесу, але пасьля нейкі пан рэфэрент прыехаў з панам Кярсноўскім і ўгаварыў сялян, што лепей высеч, а зямлю пан Кярсноўскі згодзіцца прадаць сялянам, што і зрабілі. Лес зьвезены на бераг Вяльлі, высечаны ўлетку, неяк быў часова заарыштаваны праз паліцыю, але пасьля пан прадаў і сплавіў, а на ўсе пратаколы, што паліцыя рабіла, казаў „трэба гвіздаць“. Цяпер прыйшоў час вёсцы Маркаўцы плаціць дабром за зямлю сэрвітутную, на каторай лес яшчэ расьцець, але ўжо прадану Зэфу (з Вільні) і гэтай зімой пэўне будуць сеч. Дзеля таго, што хлеба сяляне ня маюць, дык адны згодзіліся пану абгарадзіць маёнтак, другія-ж возяць, сеюць, — ну, адным словам, кажуць самі: трэба йсьці служыць „дзела“, замест пайсьці зарабіць які грош на падаткі; а пан Кярсноўскі, кажуць, нават падаткі ня плаціць, а калі і плаціць, дык мізэрныя, бо ён быў „зьнішчаны вайной“, а мы „ня зьнішчаны“.

Адным словам, ад нас адвярнуўся і Бог і людзі. Ня ведаем, якія цяпер парадкі, дык і паступаем, ня ведаючы, але рэдка хто ўспомне пана і яго матку добрым словам. Сяляне помняць яшчэ даваенныя часы, як пані лётала за каморнікам і адразала нашыя шнуры, і без таго вузкія; шмат хто помніць, як аралі нашы дзяды і бацькі папасечныя шнуры, але цяпер вырас там лес, і пан яго прадаў, а нам прадаў тую зямлю, якая калісьці была нашай і за каторую нават судзіліся да вайны, а цяпер за яе ідзем служыць „дзела“, а—не, то выплачвай сотні пудоў жыта, каторага бадай — што няма.

Гэты пан Кярсноўскі крыўдзіць ня толькі адных нас, але шмат з якой вёскай ён маець суды; напрыклад з Жодзішкамі. Там яшчэ горшая справа, як кажуць нашы сяляне, але што-ж зробіш, калі кажуць, „цяпер іх права“, і нас ніхто ня слухае, а яго пусьцяць і да ваяводы, і да міністра, дый, як пану, яму ўсе верань, а нам? З намі гавораць, як з дурнямі, і калі паедзем пажаліцца, дык толькі ў гміне яшчэ патрапім гаварыць. Дый і гміна залежыць ад Кярсноўскага, бо ён і там наганяець дыхту, з ім лічыцца і пастарунак, адным словам, прымаюць папанску і ўсё яму можна, можна і лес прадаць, і арыштаваны (лес на беразе, каля парому) сплавіць, а нам толькі служы „дзела“, ды ўздыхай да Бога, а можа калі Бог і зьлітуецца?! **„Тутэйшы“.**

Культурнае жыцьцё у Радавай Беларусі.

Беларуская акадэмія Навук.

„Słowo“ наказуе:

Цантральны Выканаўчы Камітэт Беларусі пастанавіўператварыць Інстытут Беларускае Культуры ў сталую дзяржаўную вышэйшую навуковую ўстанову, на ўзор Акадэміі Навук. У часе дыскусіі аб гэтай справе прамоўцы адзначалі заслугі бальшавізму дзеля разьвіцьця беларускае літэратуры, тэатру—пад той час, як заходняя часьць Беларусі „стогне пад панскім ярмом“.

Вышэйшыя беларускія курсы ў Менску.

15 кастрычніка курсы распачалі сваю працу.

Асаблівая ўвага зьвернута на беларускую мову, граматыку і гісторыю мовы, якой аддаецца 230 гадзін, а таксама гісторыі бел. літаратуры. Пачэснае месца ў радзе іншых прадметаў займаюць пэдалёгія і мэтодыкі розных прадметаў.

На вывучэньне матэрыялізму і ленінізму з паліт.-эканоміяй даецца 110 гадз. Усяго да канца навуковага году налічаецца 210 вучэбных дзён. Штодзённых заняткаў—6 гадз.

Да выкладаньня запрошаны самыя лепшыя сілы менскіх навуковых установ.

Вынікі прыёму ў вышэйшыя школы.

У вышэйшыя школы Беларусі ў сёлетнім вучэбным годзе прынята 1087 студэнтаў.

Па нацыянальнасьці студэнцтва разьмяркоўваецца гэтак: беларусаў—642, жыдоў—297, палякаў—9, расейцаў—121, іншых—18.

Па сацыяльнаму становішчу: рабочых — 233, служачых—408, сялян—442, іншых—4.

Паміж школамі студэнты падзяляюцца: Белар. Дз. Унівэрсытэт—470 (мэдыц. факул—132, пэдагаг.—338), Менскі сельска-гаспадарч. Інстытут—167, Горацкі сел. гасп. інстытут—110, Віцебскі вэтэр. інст.—100, Менскі раб. фак. — 110, Аршанскі—100, Горацкі—30.

Паштовая скрынка.

Нашым карэспандэнтам. Часта ў карэспандэнцыях аўтары іх стараюцца пераказаць словы польскіх урадоўцаў **папольску**, ды з гэтага выходзіць такая каша, што нельга зразумець, у чым справа. Вось і просім: калі ня ведаеце польскае мовы, пішыце ўсё пабеларуску, бо інакш праца марнуецца,—а падаваць „польскія“ выражэньні, перакручаныя да непазнакі, мы ня можам, бо **так** ніхто з урадоўцаў напэўна ня мог выражацца!

Рэдактар-Выдавец **Антон Войцік.** Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.